«Вясна» — «экстрэмісцкае фармаванне».
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Дзесяцярых палітвязняў асудзілі па справе ўдзельнікаў чата

19.07.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, палітвязні



19 ліпеня 2021 года суддзя Дзмітрый Астапенка вынес прысуд дзесяці палітвязняў, якіх прызналі вінаватымі паводле арт. `293`, `218`, `295` Крымінальнага кодэкса. Іх пазбавілі волі на тэрміны ад пяці да дзевяці гадоў у калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Пяць гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму прысудзілі:

(паводле ч.1 арт. 13 Крымінальнага кодэкса і ч.2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса)

- 23-гадоваму оптыку Арцёму Касакоўскаму
- 37-гадоваму Дзмітрыю Ластоўскаму
- 31-гадоваму Дзмітрыю Жэбуртовічу

Восем гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму прысудзілі:

(шляхам частковага складання пакаранняў: паводле ч.1 арт. 13 Крымінальнага кодэкса і ч.2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса пракурор папрасіў прызначыць ім пяць гадоў, паводле ч.1 арт. 13 і ч.3 арт.218 — сем гадоў)

- 40-гадоваму будаўніку **Паўлу Нядбайлу**
- 33-гадоваму архітэктару, дызайнеру **Расціславу Стэфановічу**
- 26-гадоваму зваршчыку **Яўгену Прапольскаму**
- 23-гадоваму **Аляксандру Рэзніку**
- 48-гадоваму сістэмнаму адміністратару **Сяргею Плонісу**
- 20-гадоваму **Арцёму Міцуку**
- **Аляксандру Юрчыку** (не з'яўляецца палітвязнем)

Дзевяць гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму прысудзілі:

(шляхам частковага складання пакаранняў: паводле ч.1 арт. 13 Крымінальнага кодэкса і ч.2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса пракурор папрасіў прызначыць яму пяць гадоў, паводле ч.1 арт. 13 і ч.3 арт.218 — сем гадоў, паводле ч.2 арт. 295 — пяць гадоў без штрафа):

- 38-гадоваму інжэнеру СПА, мэнэджару **Юрыю Бялько**

Менавіта такія пакаранні запрошваў старшы памочнік пракурора Ленінскага раёна **Аляксандр Рамановіч.** Падчас абвяшчэння прысудаў з вязняў не знялі кайданкі. Некалькі з іх, а таксама некаторыя слухачы ў залі выкрыкнулі "Жыве Беларусь!"

Суд таксама абавязаў палітвязней выплаціць судовыя выдаткі: **911 рублёў 57 капеек — Юрыя Бялько** і **1 рубель 40 капеек — Дзмітрыя Жэбуртовіча**.

Як разглядалі справу?

Некалькі палітвязняў заявілі аб катаваннях падчас затрымання або напісання «чыстасардэчных прызнанняў».

Усіх іх абвінавацілі ва ўдзеле ва ўдзеле ў телеграм-чаце «радыкальнага напрамку». У паказаннях фігуруюць некалькі чатаў — у прыватнасці, «ОГСБ» (Отряд гражданской самообороны), «Подработка Минск», «100», «101». Акрамя гэтага — у намеры пашкодзіць або знішчыць тры «Табакеркі».



Фігурант "справы 11-ці ўдзельнікаў чата": Карпянкоў асабіста здымаў "пакаяльнае відэа" на камеру

Давід распавёў "Вясне" аб гэтай крымінальнай справе, аб збіцці і ціску, якому падвергнуліся яго фігуранты і пра тое, што асабіста яму давялося перажыць падчас следства.



Амаль месяц разглядаецца справа дзесяці палітвязняў: некаторыя з іх заяўляюць пра катаванні

«Вясна» распавядае, што вядома пра гэтую справу.



«У гэтай клетцы няма злачынцаў»

Што казалі ў спрэчках па справе аб удзельніках чата



Дзесяці палітвязням пракурор запрасіў ад пяці да дзевяці гадоў калоніі

Справу разглядае суддзя Дзмітрый Астапенка.


Опубликовать



Вясна. Правы чалавека ў …
10 284 подписчики

Подписаться на Страницу






чалавек

У Бярозе за ўдзел у пратэстах у калонію адправілі яшчэ чатырох чалавек

Чатырох чалавек асудзілі да калоніі за ўдзел у пратэстах у Бярозе ў 2020-м годзе




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Юрыю Зянковічу дадалі яшчэ 2 гады зняволення. Цяпер ён знаходзіцца ў СІЗА КДБ

"Людзей прымушаюць пакідаць краіну". Што казаў праваабаронца "Вясны" на канферэнцыі АБСЕ


"Тое, што адбываецца ў беларускіх калоніях — гэта і ёсць катаванні" — Руслан Акостка

"Пра гэта казаць цяжка, але людзі забываюць", — палітвязень па "справе Зельцэра" ў гадавіну затрымання (відэа)




ГАЛОЎНАЕ

"Мне пастаянна сніцца затрыманне". Гісторыя былой палітзняволенай Наталлі Кукішавай







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Верасень 2024

Новыя аргументы на карысць адмены смяротнага пакарання: пагрозы і "плюшкі" для рэжыму Лукашэнкі

У Брэсце яшчэ 5 чалавек асудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту 10 жніўня 2020-га

Крымінальная справа супраць удзельнікаў платформы "Новая Беларусь": хроніка пераследу 8 кастрычніка (дапоўнена)

Праваабарончая праграма "Вясна"

"Людзі не адчуваюць сябе свабоднымі, нават трымаючы ў руках свае смартфоны". Што казалі беларускія праваабаронцы на канферэнцыі АБСЕ

Абмежаванне, мараторый, адмена: як Літва пазбавілася смяротнага

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Верасень 2024




ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh





















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

